# НАПІСАННЕ САЧЫНЕННЯЎ ПА СЕРЫІ СЮЖЭТНЫХ МАЛЮНКАЎ

**М.І. Сянкевіч**

Асноўная задача работы па развіццю мовы ў пачатковых класах заключаецца ў тым каб навучыць дзяцей выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія рэгламентаваны існуючымі праграмамі для школы. Каб паспяхова вырашыць гэтую задачу неабходна сфарміраваць цэлы комплекс маўленчых уменняў успрымаць выказвыанне, паслядоўна і правільна перадаваць Яго змест а таксама ствараць сваё ўласнае выказванне. Усе гэтыя маўленчыя ўменні цесна звязаны і фарміруюцца не інакш як з апорай на тэкст.

У пачатковых класах дзеці вучацца ствараць вусныя і пісьмовыя тэксты апавядальнага і апісальнага характару, а таксама тэксты апавядальнага характару з элементамі разважання.

Развіццё звязнай мовы (праца з тэкстам) ў пачатковых класах ідзе ў двух напрамках:

а) навучанне малодшых школьнікаў асэнсаванаму ўспрыманню твора як з'явы мастацтва слова, вызначэнне яго эстэтычнага зместу праз "мову вобразаў";

б) навучанне дзяцей складаць ўласныя тэксты, у якіх выяўляліся б адносіны аўтараў да тых ці іншых праяў рэчаіснасці і якія спрыялі б развіццю творчых здольнаясцяў вучняў, самавыхаванню і самаўдасканаленню асобы. У дадзеным артыкуле размова пойдзе пра другі накірунак гэтай дзейнасці, а канкрэтней, пра фарміраванне ў малодшых школьнікаў умення складаць звязныя выказванні па серыі сюжэтных малюнкаў. Мы намераны падрабязна разгледзець асноўныя этапы гэтай працы, але спачатку існуе неабходнасць у рэчышчы абазначанай тэмы паразважаць над некаторымі прыватнымі пытаннямі.

## ЗНАЧЭННЕ МАЛЮНКАЎ І СЕРЫІ МАЛЮНКАЎ Ў РАЗВІЦЦІ МОВЫ ВУЧНЯЎ

Сачыненне па серыі малюнкаў адзін з важных элементаў у сістэме работы па развіцці звязнай мовы вучняў, які прадугледжвае паслядоўнае развіццё ў школьнікаў неабходных камунікатыўных уменняў і навыкаў самастойнай працы.

Малюнкі і серыі малюнкаў аказваюць эмацыянальнае уздзеянне на дзяцей, дапамагаюць больш упэўнена арыентавацца ў прасторы і часе. Яны – незаменны сродак для развіцця назіральнасці, уяўлення, мастацкага густу. Яркі, цікавы малюнак асаблівым чынам уздзейнічае на пачуцці дзяцей, іншым разам адчыняе перад імі тыя бакі жыцця, з якімі дзеці не маглі сутыкнуцца ў сваім непасрэдным вопыце, дапамагае глыбей зразумець з'явы, з якімі вучні ўжо знаёмы. Карціна найлепшым чынам збліжае настаўніка і вучняў, з'яўляецца выдатным матэрыялам для

суразмоўніцтва. Ніколі не згубяць сваёй актуальнасці словы К.Дз. Ушынскага, у якіх ён сцвярджаў, што малюнкамі можна ажывіць клас, прымусіць дзяцей згаварыць вольна і нязмушана.

Сачыненне па серыі малюнкаў акамуліруе ў сабе іншыя віды працы па развіцці пісьмовай і вуснай мовы: канструяванне дыялогаў, слоўнае маляванне, творчае дапаўненне, рэдагаванне асобных тэкстаў і сказаў. Нарэшце, сачыненне па серыі малюнкаў, калі яго звязваць з вывучэннем граматыкі і арфаграфіі, дапамагае актывузуе увагу вучняў, дазваляе зрабіць працу больш разнастайнай.

Усё сказанае вышэй, гаворыць аб неабходнасці актыўнага навучання малодшых школьнікаў сачыненням такога кшталту. Аднак у пэўнай частцы настаўнікаў і метадыстаў існуе думка, што творы жывапісу, а тым больш малюнкі і серыі малюнкаў, якія творамі жывапісу можна назваць вельмі ўмоўна, не спрыяюць развіццю маўлення па той прычыне, што не даюць моўага ўзору. Нельга сказаць, што дадзеная думка цалкам не мае права на жыццё. Поспех працы залежыць перш за ўсё ад таго, наколькі ўдала падабраны настаўнікам матэрыял, наколькі ўдала будуць складзены пытанні. А паколькі моўнага ўзору сапраўды нама ў наяўнасці, то, безумоўна, такім узорам павінна стаць мова настаўніка.

## ПРЫНЦЫПЫ АДБОРУ МАТЭРЫЯЛУ

Бясспрэчна, што нават бездакорна выкананыя малюнкі – гэта не творы жывапісу. Перш за ўсё, гэта вучэбны матэрыял, але, рыхтуючыся да ўрока настаўніку нельга кіравацца прынцыпам “абы было па чым сачыненне пісаць”. Ён павінен уважліва адносіцца да якасці малюнкаў, не задавальняцца схематычнымі чорна-белымі “паўфабрыкатамі”. Пастараемся абазначыць той мінімум, якіга неабходна прытрымлівацца.

Па-першае, серыі малюнкаў павінны заключаць у сабе выхаваўча-эстэтычны змест.

Па-другое, неабходна, каб выразна прасочваўся сюжэт, а самі яны ўтрымлівалі адносна невялікую колькасць прадметаў.

Па-трэцяе, немалаважным з’яўляецца аспект цікавасці, бо па сведчанні псіхолагаў менавіта цікавасць стымулюе мысленне і маўленне малодшых школьнікаў і выклікае станоўчыя эмоцыі.

Нарэшце, значымым фактарам з’яўляецца і тое, што серыя малюнкаў, як сродак навучання, павінна даваць матэрыял для правядзення лексічных, стылістычных і граматычных практыкаванняў.

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АНАЛІЗУ МАЛЮНКАЎ І СЕРЫІ МАЛЮНКАЎ

Уменне разглядаць карціну залежыць ад узросту і псіхалагічных асаблівасцей вучняў. Хоць малодшыя школьнікі не вельмі добра

ўспрымаюць трохмерную прастору, але затое яны могуць без асаблівых цяжкасцей зразумець настрой карціны, пачуцці герояў. Разглядаючы і аналізуючы як асобны сюжэтны малюнак, так і серыю малюнкаў, неабходна мець на ўвазе наступныя акалічнасці:

а) накіроўваючы ўвагу на галоўнае, нельга выпускаць з-пад увагі і дэталі, бо на малюнку няма нічога лішняга;

б) успрымаючы асобны малюнак, карысна вучыць дзяцей прадбачыць тое, што адбываецца за яго межамі ўправа або ўлева. Калі сюжэтны малюнак адзін, ці серыя малюнкаў не закончана, вельмі важна, каб вучні адчувалі логіку завяршэння падзей, прадказвалі паводзіны герояў;

в) настаўніку неабходна памятаць пры аналізе малюнкаў, што ён не з'яўляецца носьбітам адзіна магчымай, непагрэшнай версіі, ён павінен прадбачыць вучнёўскія версіі, дапамагаць сваім выхаванцам выказаць словамі іх уражанні, іх трактаванне намаляванага, умела, доказна і тактоўна паправіць, калі дзіця адышло ад мастаковай задумы. Вельмі важна прадумваць як фармулёўку пытанняў так і іхнюю паслядоўнасць;

г) вельмі важна, каб вучні выказаліся адносна таго, у чым пераконвае карціна, расказалі пра падобныя выпадкі з уласнага жыцця, падзяліліся ўражаннямі сведкаў ці ўдзельнікаў здарэння.

Зразумела, што адказы вучняў не заўсёды будуць дакладнымі і лагічнымі. Іншы раз іх адчуванні невыразныя і не знаходзяць патрэбнага моўнага афармлення. У гэты момант вельмі важна дапамагчы дзецям знайсці неабходнае слова, падабраць сінонімы, пабудаваць фразу, абагуліць выказаныя думкі.

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАЦЫ З МАЛЮНКАМІ І СЕРЫЯМІ СЮЖЭТНЫХ МАЛЮНКАЎ У ПЕРЫЯД НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Канкрэтныя ўменні па складанню элементарных звязных выказванняў шасцігодкі атрымліваюць ужо ў перыяд навучання грамаце. Зыходным лічыцца ўменне "складаць па малюнку ці серыі малюнкаў пэўную колькасць сказаў у межах адной тэмы або невялікага расказу з захаваннем логікі сюжэту".

На першым часе, складаючы звязнае выказванне па сюжэтных малюнкамі буквара, дзеці ідуць услед за тэкстам. У некаторай часткі вучняў можа скласціся перакананне, што ў тэксце расказваецца пра тое, што напісана ў падручніку. Таму ў гутарцы настаўнік стараецца па магчымасці "адвесці" вучняў ад тэкста. Ён можа прапанаваць на тую ж тэму малюнкі іншага зместу.

Настаўніку трэба памятаць і пра тое, што першыя букварныя тэксты дастаткова прымітыўныя па той прычыне, што галосныя літары ўводзяцца пастунова, на працягу даволім значнага часу. Пастунова ўскладняецца таксама структура слоў, якія чытаюцца. Вусныя выказванні шасці-сямігадовых дзяцей на гэты час куды цікавейшыя за тэксты буквара.

Гэтую акалічнасць настаўніку трэба ўлічваць пры складанні звязных выказванняў па букварных малюнках.

Між тым узнікае другая крайнасць: дзіця стараецца паведаміць як мага больш падрабязнасцей без усякага падзелу іх на галоўныя і другарадныя. Апавяданне атрымліваецца сумбурным і непаслядоўным. Пры чым нават асобныя думкі (сказы) у ім цяжка бывае выдзеліць. Каб дзіця "гаварыла сказамі", па малюнку, як гэта прапаноўвалася ў методыках выкладання папярэдніх дзесяцігоддзяў (М.Ц. Марчанка, Н.І. Палітава) лепш за ўсё складаць апавяданні па аднолькаваму плану, што складаецца з трох пытанняў. Акрамя ўсяго, гэте практыкаванне стане прапедэўтычнай падрыхтоўкай да складання апавядання ў трох частках. Вучань павінен сказацьадказаць на наступныя пытанні.

1. Дзе  і калі гэта адбылося?

2. Што здарылася з героямі, паказанымі на малюнку?

3. Як закончылася здарэнне?

Прыведзеныя вышэй пытанні ў далейшым, калі дзеці набудуць першапачатковыя навыкі самастойнай працы, можна  замяніць "пытаннямі-памочнікамі"? "Дзе?", "Калі?", "Што?", "Як?". Вучань будзе памятаць, што на першыя і апошняе пытанне трэба адказаць коратка, а на другое – больш падрабязна і што пасля адказу на другое пытанне нельга вяртацца да папярэдніх. Вучань, такім чынам, пачынае аддзяляць галоўнае ад другараднага, перадаваць свае думкі паслядоўна, сувымяраць часткі.

У паслябукварны перыяд вучні першага класа здольны вусна "дамаляваць" падзеі, што папярэднічалі паказаным на малюнку, ці маглі адбыцца пасля. Для гэтага дзецям прапануецца сюжэтны малюнак ці фрагмент з серыі малюнкаў на блізкую для разумення тэму, праводзіцца неабходная слоўнікавая падрыхтоўка. Напрыклад, каб скласці апавяданне па змешчанаму ніжэй малюнку пра няўдачлівага рыбалова, настаўнік павінен задзейнічаць у папярэдняй гутарцы такія словаы як *рыбак, вудачка, вудзільна, кручок, паплавок, бляшанка, прынада, улоў, белабокая, хітрая...* Далейшы дыялог можа весціся ў наступным парадку:

– Дзе і калі гэта здарылася?

–  Гэта здарылася летам на рэчцы?

–  Раскажыце, калі ласка, што адбылося.

– Хлопчык уважліва сачыў за паплаўком. Хітрая сарока падкралася да бляшанкі. Яна з’ела ўсе чарвякі.

– Што здарылася пасля?..

Апошняе пытанне прымушае працаваць уяўленне, бо не вымагае аднязначнага адказу. Хлопчык мог вярнуцца дамоў без улову, знайсці чарвякоў пад старым вываратнем, вудзіць на хлеб, які захапіў на абед, не выключана, што на дапамогу яму прыйшлі больш спрактыкаваныя рыбакі.

На ўроках  ў першым класе беларускамоўных школ  дзеці вучацца узнаўляць казку па серыі малюнкаў, пераказваць асобны эпізод, параўноўваць тэкст знаёмай казкі і ілюстрацыі да яе, размяшчаць ілюстрацыі ў патрэбным парадку У першым класе, настаўнік практыкуе

таксама складанне асобных сказаў па выразных пейзажных малюнках, тым самым вядзецца прапедэўтычная падрыхтоўка для сур’ёзнай працы з творамі выяўленчага мастацтва ў наступных класах. На гэтым этапе ідзе назапашванне “колерава” слоўніка, дзеці вучацца назіральнасці, уменню параўноўваць. Апісваючы, напрыклад, восеньскі пейзаж, яны складаюць сказы пра лісце клёна і бярозы, пра ягады рабіны, пра сямейку баравікоў пад яловымі лапкамі... Сказы дапаўняюцца, рэдагуюцца, узбагачаюцца вобразнымі азначэннямі.

У перыяд навучання грамаце першакласнікі не пішуць звязных тэкстаў (складаюць іх вусна), а запісваюць толькі асобныя словы. Але і асобнае слова можа быць раўназначна цэламу тэксту, калі гэтым словам названы цэлы малюнак. (“Лес”. “Луг”. “Буслы”.) У такіх выпадках яно служыць для абагульнення ўрыўка са звязнага тэкста. Неабходна выбіраць малюнкі, якія звязаны з жыццёвымі ўражаннямі першакласнікаў. Такія словы нараджаюць у свядомасці дзіцяці думкі, пачуцці, якія тое будзе імкнуцца выказаць адпаведнымі словамі, словазлучэннямі і сказамі.Напрыклад, пасля экскурсіі ў вясновую прыроду вучні з асаблівым стараннем прагаворваюць і запісваюць слова “бярозка”, якое абагуліць мноства ўражанняў і абавязкова стане тэмай для вуснага выказвання. Вярнуўшыся з зімовай прагулкі яны з гэтакім жа стараннем выводзяць “зіма”, “снег” і з задавальненнем падбіраюць вобразныя азначэнні. За кожным з гэтых паняццяў цэлы малюнак, ланцужок успамінаў.

## САЧЫНЕННЕ ПА СЕРЫІ МАЛЮНКАЎ У ДРУГІМ КЛАСЕ

Праграмныя патрабаванні да звязнай мовы другакласнікаў значна пашыраюцца. Вучні павінны разумець структуру тэкста, пад кіраўніцтвам настаўніка складаць яго план і пераказваць па плану, падбіраць загаловак, усведамляць сэнсавую сувязь сказаў у тэксце, вызначаць яго тэму і асноўную думку, нарэшце, яны павінны ўмець ствараць тэкст на зададзеную тэму. У адпаведнасці з абазначанымі вышэй патрабаваннямі, настаўнік павінен падабраць сістэму практыкаванняў у звязнай мове, адным з якіх (на нашу думку, у другіх-трэціх класах яно займае вядучае становішча) з’яўляецца складанне вусных і пісьмовых апавяданняў па серыі малюнкаў на зададзеную настаўнікам тэму.

Для вучняў другога класа сачыненне па серыі малюнкаў з’яўляецца дастаткова складаным практыкаваннем у звязнай мове. Малюнкі паказваюць толькі на тое, аб чым трэба напісаць (сказаць). Але, як ужо заўважалася. Не даюць дакладнага моўнага матэрыялу. Адна справа – зразумець сюжэт, і зусім іншае – скласці вуснае выказванне. Але ўсё ж найскладанейшая задача – перавесці вуснае выказванне ў пісьмовае, паколькі, як даказана вучонымі-псіхалінгвістамі (Л. Выгоцкі, Л. Занкоў, Ш. Аманашвілі) пісьмовую мову нельга разглядаць як прстую суму двух складаемых – вуснай мовы і навыку пісьма.

Зразумела, што пры складанні апавядання па малюнках навучанне

дзяцей ідзе па лініі ўскладнення самастойнасці вучняў, ускладнення тэм і зместу малюнкаў.

Працу ў дадзеным напрамку ў другім класе мэтазгодна пачаць са складання *апавядання па серыі малюнкаў і па пытаннях*. Каб прапанаваць узор такой працы, мы выбралі серыю малюнкаў “Сябры птушак”. У падручніках для пачатковай школы розных гадоў выдання заўсёды знаходзілася месца малюнкам, якія дапамагаюць глыбей асэнсаваць названую тэму.

Задачы працы на ўроку зводзяцца да наступнага: а) фарміраваць уменне разглядаць карціну, вылучаць на ёй дэталі, якія суадносяцца з тэмай сачынення;б) удасканальваць уменне перадаваць змест малюнкаў; г) вучыць дзяцей выдзяляць часткі ў тэксце, падбіраць назву, якая абагульняла б змест выказвання.

Знаёміцца са структурнымі часткамі тэкста, адпрацоўваць уменні, звязаныя з яго пабудовай, можна таксама праводзячы практыкаванні на *ўзнаўленне дэфармаванага тэкста па сюжэтных малюнках*. На ўроку будуць вырашацца наступныя задачы: Узнаўленне дэфармаванага тэкста па сюжэтных малюнках з творчым заданнем. Задачы такога ўрока:

а) фарміраваць уменне суадносіць загаловак тэкста з галоўнай думкай;

б) вучыць дзяцей выдзяляць структурныя часткі сачынення ў адпаведнасці з планам і выдзяляць іх пры запісе;

в) вучыць дзяцей разглядаць малюнкі, заўважаць асобныя дэталі; г) спрыяць развіццю творчага ўяўлення вучняў іх маўленчай практыкі.

Агульны парадак працы па серыі сюжэтных малюнкаў у другім-трэцім класах можа быць наступным.

1. *Паведамленне задач урока*

2. *Вызначэнне тэмы сачынення* (пра што, пра каго, будзем складаць апавяданне).

3. *Уступная гутарка*. Яна праводзіцца толькі пры неабходнасці. У час уступнай гутаркі дзеці могуць успомніць свае назіранні за прыродай, цікавыя здарэнні.

4.*Свабоднае разглядванне малюнкаў*. Добра, калі камплект малюнкаў маецца на кожнай парце. Сюжэтныя малюнкі могуць быць размешчаны па парадку (дадзены гатовы малюнкавы план) ці разрэзаны (іх неабходна размясціць паслядоўна). Пры адсутнасці раздатачнага матэрыялу аналагічную працу можна правесці на дошцы з малюнкамі дастаткова вялікага фармату. Настаўніку не варта спяшацца ставіць пытанні. Важна, каб дзеці самі ўстанавілі асноўны змест, пастараліся выказаць яго “сваімі словамі”.

5. *Вусны расказ па малюнках з дапамогай удакладняючых пытанняў настаўніка*

Дзецям на малюнку даюцца імёны, свойскім жывёлам – клічкі. Калі ў серыі прапанаваных малюнкаў розныя героі, настаўнік можа запытацца, па якіх прыкметах іх можна пазнаць.

Вучні абдумваюць апавяданне.

Настаўнік дае пачатак апавядання, вучні, дапаўняючы адзін другога, працягваюць яго. На гэтым этапе праводзіцца праца па прадухіленню ўжывання вучнямі адных і тых жа слоў. Гэтага не здарыцца, калі, складаючы пытанні настаўнік паклапоціцца пра тое, каб у іх не паўтараліся адны і тыя ж лексемы (часцей за ўсё: *што робіць*?).

У працэсе вуснага расказвання мадэлюецца дыялог герояў. Калі гэтае заданне здасца цяжкім, настаўнік можа проста запытацца, пра што могуць размаўляць дзейныя асобы.

Несумненна, што вуснае сачыненне не заўсёды заканчваецца пісьмовым, але пісьмоваму заўсёды папярэднічае вусная падрыхтоўка. Іншы раз для пісьмовай працы ў трэцім і чацвёртым класах могуць выкарыстоўвацца серыі малюнкаў, па якіх у другім класе дзеці складалі вусныя сачыненні.

6. *Вызначаецца галоўная думкаі апавядання, падбіраецца загаловак*.

У кожным выпадку неабходна, каб дзеці выказалі сваю уласную думку адносна таго, што здарылася. Гэта развівае маўленчую практыку вучняў, вучыць іх выказваць свае ўражанні, дыскутаваць, даказваць правамернасць сваіх поглядаў. Пытанні настаўніка могуць быць наступнымі:

– Пра што вы падумалі, разглядаючы малюнак?
– Як вы ацэньваеце ўчынак героя?
– Што хацеў сказаць нам мастак?
– Чаму ў дзяцей шчаслівыя (сумныя, невясёлыя) твары?

У першых сачыненнях загаловак можа выбірацца з некалькіх прапанаваных настаўнікам. У канцы другога класа і ў трэцім класе – прапаноўвацца вучнямі. У трэцім класе вучні пад кіраўніцтвам настаўніка падбіраюць загалоўкі як да ўсяго апавядання, так і да кожнага малюнка (складаецца калектыўны план).

7. *Вусна складаюцца сказы да кожнага з прапанаваных малюнкаў.* Яны папраўляюцца, рэдагуюцца. Адначасова праводзіцца слоўнікавая праца (можа быць прапанаваны спіс “карысных слоў” у парадку развіцця сюжэта”). У першых сачыненнях, калі план мае выгляд пытальных сказаў, побач (справа) даюцца словы, якія не сустрэліся ў такім сказе, а слова, якое ў апавядальным сказе будзе першым – падкрэсліваецца.

8. *Вучні паўтараюць апавяданне па частках (малюнках) і цалкам*. Клас робіць заўвагі. Настаўнік у кожным выпадку пытае, ці хоча нехта дабавіць. Звяртаецца ўвага на “словы-мосцікі”, што звязваюць асобныя структурныя часткі. У канцы другога года навучання малюнкі можна прыбраць, пакінуўшы на дошцы толькі план. У гэты ж час можна адмовіцца ад вуснага ўзнаўлення ўсяго тэксту перад запісам.

9. *Самастойная праца вучняў*. Настаўнік аказвае індывідуальную дапамогу.

10. *Самаправерка*. Пры выпраўленнях і дапаўненнях вучні раяцца з настаўнікам.

11. *Праверка пісьмовых прац настаўнікам.*

12. *Калектыўнае рэдагаване творчых прац (на наступным уроку).*

Хочацца выказаць некалькі асабістых думак адносна плана сачынення.

Неабходна як мага раней запісваць план загалоўкамі, а не пытаннямі. Гэты пераход павінен быць цесна звязаны з адпаведнай працай на ўроках літаратурнага чытання. Так паводле існуючых праграм ужо другакласнікі, рыхтуючыся да пераказу, вучацца складаць калектыўны план са сказаў тэксту, што нясуць асноўную сэнсавую нагрузку.

Думаецца, што не кожнае пісьмовае выказванне вымагае плана. Асабіста нам вядомы выпадкі, калі вучні пятага-шостага з добрай чытацкай падрыхтоўкай, развітым творчым уяўленнем і эмацыянальнай памяццю складалі план (бо гэтага патрабаваў настаўнік) ужо пасля таго, як цікавае, запамінальнае сачыненне напісана. У пачатковых класах план сачынення план не заўсйды павінен запісвацца нават на дошцы. Неабходна вучыць дзяцей трымаць парадак дзеяння “ў галаве”, ясна ўяўляць паслядоўнасць учынкаў. Такім чынам, перад запісам з дошкі план можна сцерці, пакінуўшы толькі малюнкі, (а ў добра падрыхтаваным класе прыбраць і малюнкі).

Каб не абмяжоўваць самастойнае мысленне дзяцей і працу іх творчага ўяўлення, варта таксама часцей даваць ім магчымасць складаць апавяданне па малюнках без папярэдняга разбору пад кіраўніцтвам настаўніка.

Як ужо адзначалася, пачынаючы з другога класа можна вучыць дзяцей складанню дыялогаў, якія ажыўляюць малюнкі. Зразумела, што гэтая праца праводзіцца пад кіраўніцтвам настаўніка пры складанні вуснага апавядання, паколькі перадаць дыялог на пісьме дзеці навучацца вельмі не хутка.

## САЧЫНЕННЕ ПА СЕРЫІ МАЛЮНКАЎ У ТРЭЦІМ КЛАСЕ

У трэцім класе далей адпрацоўваюцца ўменні, звязаныя з пабудовай тэкста, найперш апавядальнага характару. Вучні павінны навучыцца ствараць (вусна і пісьмова) уласныя тэксты па сюжэтных малюнках і серыі малюнкаў пра перажытае і ўбачанае. Узмацняюцца патрабаванні да мовы сачынення. Дзеці вучацца карыстацца сказамі living рознай інтанацыйнай канструкцыі, выкарыстоўваць сінонімы, антонімы, вобразныя словы і выразы.

У трэцім класе настаўнік ставіць перад сабой наступныя мэты:

а) фарміраваць ўменне вызначаць і раскрываць асноўную думку сачынення;

б) вучыць дзяцей уменню звязваць у адно цэлае сказы і часткі тэкста;

в) удасканальваць уменне вучняў складаць тэкставы план на аснове малюнкавага, дзяліць тэкст на абзацы і запісваць іх з чырвонага радка;

г) узбагачаць слоўнікавы запас вучняў, вучыць іх разуменню мнагазначнасці слова, ўжыванню вобразных сродкаў мовы, тэкставых сінонімаў.

## САЧЫНЕННЕ ПА СЕРЫІ МАЛЮНКАЎ У ЧАЦВЁРТЫМ КЛАСЕ

Сачыненні па серыі малюнкаў найчасцей выкарыстоўваюцца ў другім і трэцім класах, але, думаецца, што і ў чацвёртым класе іх нельга ігнараваць. У прыватнасці, на матэрыяле такіх сачыненняў можна і далей адпрацоўваць навык складання плана, афармлення абзаца. У апавядальны тэкст па малюнку вучні здольны ўводзіць элементы апісання і разважання. На гэтым этапе яшчэ больш узрастае ўвага да моўных сродкаў, асабліва тых, што перадаюць пачуцці герояў. Па малюнках вучням чацвёртага класа падабаецца складаць жартоўныя апавяданні павучальнага зместу. У чацвёртым класе фарміруецца ўменне выкарыстоўваць у тэксце моўныя сродкі выразнасці, якія перадаюць стан і пачуцці герояў.

У чацвёртым класе добра даваць заданні на параўнанне малюнкаў, у якіх паказана адна і тая ж мясцовасць у розную пару года або ў рознае надвор’е. Ствараючы тэксты апісальнага тыпу, вучні практычна знаёмяцца з ужываннем сінонімаў і антонімаў, аднародных членаў сказа, вучацца дакладнасці словаўжывання, убагачаюць слоўнікавы запас вобразнымі азначэннямі. Добра складаць антанімічныя па сэнсу сказы, параўноўваючы зімовыя і летнія пейзажы.

| *Вясна* | *Восень* |
|---|---|
| *Неба чыстае, блакітнае, бяздоннае...* | *Неба нізкае, хмарнае, дажджлівае* |
| *Сонца......* | |
| *Вецер.......* | |

Серыю малюнкаў можна выкарыстаць на занятках па развіцці творчых літаратурных здольнасцей вучняў. Настаўнік прапаноўвае пачатак апавядання, выстаўляе малюнак, на якім хоча зафіксаваць увагу дзяцей. Па малюнку даецца пейзажнае апісанне ці апісанне нейкіх акалічнасцей здарэння. Вучні прапаноўваюць варыянты працягу пачатай гісторыі. Калі такія пошукі не прыносяць жаданага выніку, выручае наступны малюнак. Такім чынам вучнямі могуць “перапісвацца” невядомыя ім мастацкія апавяданні сучасных аўтараў або складацца новыя варыянты. Прапануем фрагмент заняткаў літаратурнага гуртка, на якіх настаўнік актывізуе творчае ўяўленне малодшых школьнікаў, вучыць іх уносіць у апавядальны тэкст элементы апісання, выхоўвае паважлівыя адносіны да слова.

На дошцы запісана назва апавядання, «Горкія апельсіны». Настаўнік прапануе яго пачатак:

– Дзіма і яго сябры-аднакласнікі  Пеця і Васіль ішлі на лыжах па лясной сцежцы. Быў сонечны марозны дзень…

– Пастарайцеся апісаць, – звяртаецца настаўнік да дзяцей, – сонечны марозны дзень у лесе. (Вывешваецца каляровы фотаздымак ці якасна выкананы малюнак. Вучні апісваюць яліны пад снегам, камлі дрэў, сляды на снезе, падбіраюць азначэнні да слова “снег”...).

– Хлопчыкі весела смяяліся, – працягвае педагог, – жартавалі, і раптам Пеця – ён быў крыху старэйшы за іншых і самы дужы – гучна крыкнуў: «Давайце  навыперадкі!». Пеця рвануўся наперад, следам за ім памчаўся Васіль, бо ён таксама быў нядрэнным лыжнікам…

– Што магло здарыцца з Дзімам? Якая бяда падсцерагае нявопытнага лыжніка? –  задае пытанне настаўнік. (Вучні стараюцца ўявіць сябе на месцы хлопчыка, шукаюць словы, каб перадаць  яго адчуванне: «не было сілаў бегчы», «ішоў, правальваючыся ў снег», «намачыў ногі...»). На дошчы ў гэты час можа з’явіцца малюнак збянтэжанага хлопчыка, які ў руках трымае адарванае лыжнае мацаванне ці паламаную лыжу. Удалечыні – сілуэты яго таварышаў.

– Чым магла закончыцца гісторыя? – пытае настаўнік. Калі вучні не знойдуць цікавага працягу (зусім не цікава, калі малыя пасварыліся або Дзіма нейкім чынам адпомсціў аднакласнікам) настаўнік вывешвае на дошцы малюнак: хлопчыкі прыйшлі да хворага сябра.

– Паглядзіце на малюнак: чым яшчэ магла закончыцца гэта гісторыя? – пытаецца педагог.

Выказванні вучняў у асноўным зводзяцца да наступнага: Пеця і Васіль прыходзяць адведаць хворага сябра, просяць у яго прабачэння, кажуць, што яны пакінулі яго ненаўмысна, ды і лыжня ўезджаная.

Па малюнку добра гаварыць пра  адчуванні кожнага героя. Апісваючы стан хворага, дзеці гавораць пра, «агонь у горле», пра «нясмачнае піражнае», расказваюць пра лячэнне прастуды...

Далей можна абысціся без ілюстрацыйнага матэрыялу. Дзіма прымае ласункі (наконт гэтага можна падыскутаваць), але любімыя апельсіны наўрат ці здадуцца яму салодкімі. Не выключаны і другія варыянты заключнай часткі. Фантазія вучняў часта бывае непрадказальнай. Да таго ж і жыццёвы вопыт у дадзеным выпадку мае месца.

Такім чынам, вучні нязмушана набываюць літаратурны вопыт, вучацца шукаць патрэбнае слова для падмацавання думкі, напаўнення мастацкага вобраза  неабходным зместам.

Навучанне сачыненню па малюнках, як і навучанне ўсякай іншай творчай працы, не мае ніякага сэнсу, калі не вучыць малодшых школьнікаў прыёмам рэдагавання. Рэдактарскія праўкі ўносяцца як пры напісанні калектыўных сачыненняў, так і ў самастойных творчых працах. Робіцца гэта тактоўна, каб прыахвоціць дзяцей да гэтага неабходнага віду моўнай дзейнасці, кожнае выпраўленне матывуецца. Добра, калі вучні прызвычаяцца карыстацца “Памяткай для рэдактара”. Яна можа мець прыведзеную ніжэй форму.

ПАМЯТКА ДЛЯ РЭДАКТАРА

Перачытай сачыненне і правер:

- *ці няма ў тэксце лішніх слоў ;*
- *ці не прапушчана слова;*
- *ці мэтазгодна памяняць парадак слоў у сказе);*
- *ці правільна вызначаны межы сказаў;*
- *ці не мэтазгодна аб'яднаць суседнія сказы;*
- *ці на сваім месцы стаяць сказы;*
- *ці правільна звязаны паміж сабой сказы і часткі тэкста;*
- *ці правільна выдзелены часткі тэкста;*
- *ці дакладна ўжыты прыметнікі і дзеясловы.*

Вучні, пры неабходнасці, аккуратна закрэсліваюць лішнія словы, устаўляюць зверху тыя, якія прапусцілі па няўважлівасці, аккуратна закрэсліваюць недакладныя словы і зверху ўпісваюць больш выразныя, пазначаюць лічбамі парадак слоў у сказе і г. д. Паколькі чарнавікамі вучні малодшых класаў не карыстаюцца, то было б метадычнай памылкай зніжаць адзнакі за выпраўленні, якія павышаюць якасць творчай працы.

Такой нам уяўляецца сістэма працы настаўніка па навучанні малодшых школьнікаў сачыненням па серыі малюнкаў. У заключэнні яшчэ раз падкрэслім, што праца над такімі сачыненнямі – адно з найбольш дзейсных практыкаванняў у развіцці звязнай мовы вучняў, якое ў адным радзе з іншымі відамі відамі працы, што практыкуюцца ў пачатковай школе, заклікана навучыць малодшых школьнікаў асноўным уменням працы з тэкстам, актывізаваць мысленне вучняў, развіць іх творчыя здольнасці.